Падтрымай "Вясну" на PATREON

"Гэта былі дзеянні чалавека, якога не чуюць": палітвязня Віктара Лосіка асудзілі да чатырох гадоў калоніі

19.04.2021 **Тэгі**: суды, крымінальны пераслед, грамадства, палітвязні, пераслед, ціск




19 красавіка суд Мінскага раёна вынес прысуд палітвязню Віктару Лосіку. Яго прызналі вінаватым паводле арт. 339, 341 Крымінальнага кодэксу і асудзілі да двух гадоў калоніі паводле ч.1 арт.339, да чатырох гадоў калоніі — па ч. 2 арт. 339, да месяца арышту — па арт. 341. У выніку праз паглынанне больш мяккага пакарання больш строгім Віктар Лосік асуджаны да чатырох гадоў пазбаўлення волі ў калоніі агульнага рэжыму.

Справу разгледзела суддзя Новікава. Дзяржабвінавачанне падрымала пракурор **Касінская**. Пацярпелыя — старшыня ўчастковай выбарчай камісіі ў Хацежына **Радзько** і яе намесніца **Красоўская**. Абедзве заявілі **пазоў на выплату маральнай шкоды: па тры тысячы рублёў кожнай**. Пазоў суддзя Новікава таксама задаволіла.

Суд таксама абавязаў спагнаць з Лосіка **дзяржпошліну — 174 рубля**, **судовыя выдаткі — 492 рубля 44 капейкі**.

У чым прызналі вінаватым?

Палітвязня прызналі вінаватым у тым, што ён павесіў на мосце пудзілы з фотаздымкамі міністра ўнутраных спраў і старшыні выбарчай камісіі Хацежынскага ўчастка для галасавання з надпісам “*Не забудем, не простим!”,* а таксама ў нанясенні выяваў з беларускім нацыянальным гербам “Пагоня” на збудаваннях і апорах маста. Фотаздымкі пудзілаў былі размешчаны ў чаце "Хацежына для жыцця".



Віктар Лосік прызнаў віну па артыкуле 339 і не пагадзіўся — з артыкулам 341, прынёс прабачэнні пацярпелым, пудзілы з фатаздымкамі якіх вывешваў: прызнаў усе тры факты вывешвання пудзілаў.



Палітвязня судзяць за пудзілаў і налепкі "Пагоні"

На судзе Лосік заявіў, што пры дачы паказанняў на яго рабілася маральнае і псіхічнае ўздзеянне, раскаянне выраблялася пад пераканаўчыя просьбы супрацоўнікаў РУУС.

Што казалі ў спрэчках?

Праз тры выпадкі пракурор настойваў на паўторнасці дзеянняў. Адвакат настойваў, што злачынства было адно, якое працягваецца ў часе пры выкананні: Лосік замовіў адразу тры пудзілы і планаваў вывесіць іх з партрэтамі канкрэтных асобаў, бо за адну ноч рэалізіваць гэта было фізічна немагчыма.


Пацярпелыя настойвалі на ізаляцыі Лосіка і не знізілі суму маральнай шкоды, нават калі перад судом родныя прапанавалі ім па 500 р. наяўнымі ў якасці кампенсацыі: пацярпелыя адмовіліся ад гэтага.

Што палітвязень казаў у апошнім слове?


> У апошнім слове Віктар Лосік прызнаўся, што яму сорамна за свой ўчынак і прынёс прабачэнні пацярпелым. *"Сваімі дзеяннямі з пудзіламі я не ставіў мэты непаважна аднесціся да грамадства. Усё, што я здзейсніў, звязана выключна з тым, якія пасады займалі пацярпелыя — гэта не звязана з аніякай помстай, хуліганствам. Я супраць гвалту, на той момант я не мог дагрукацца да ўладаў і данесці сваю грамадзянскую пазіцыю законнымі спосабамі, таму палічыў, што гэтыя дзеянні дапамогуць мне гэта зрабіць. Думаю, усе прысутныя разумеюць, што мае дзеянні не былі звязаныя з гвалтам ці заклікамі да яго, не неслі пагрозы грамадству. Гэта былі дзеянні роспачнага чалавека, якога не чуюць. Таму мне падаецца, што на свабодзе я быў бы больш карысным грамадству: і асабліва маёй жонцы, дзецям, сталым бацькам".*

Твитнуть









"Катаванні сталі ў Беларусі звычайнай справай". Беларускія праваабаронцы — на канферэнцыі АБСЕ


Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных

Бабруйчаніна будуць судзіць за "публічныя заклікі да арганізацыі мітынгу". Распавядаем, што гэта за артыкул

WWW.GAZETABY.CO

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА




"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"





"Народжаная пад дубінкамі на Чарнобыльскім шляху". Як пачыналася "Вясна"



#ВолюВясне



ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

Без зменаў. Адбылася апеляцыя па справе "Вясны"

Праз 27 гадоў рэпрэсій і пераследу "Вясна" працягвае сваю дзейнасць

"Суды згубілі сваю функцыю, а грамадзянская супольнасць перанесла знішчальную атаку". Павел Сапелка — на канферэнцыі АБСЕ

Праваабарончая праграма "Вясна" на Беларускім Радыё Рацыя

Грамадзяніна Польшчы асудзілі ў Беларусі за "агентурную дзейнасць"

"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

Заява аб прызнанні палітвязнямі Аляксея Камароўскага, Іллі Шакірава і Барыса Протасава

"Катаванні сталі ў Беларусі звычайнай справай". Беларускія праваабаронцы — на канферэнцыі АБСЕ

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Праз 27 гадоў рэпрэсій і пераследу "Вясна" працягвае сваю дзейнасць



ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022



ВЫДАННІ



Напрамкі дзейнасці

ПАРТНЁРСТВА

СЯБРОЎСТВА

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY